Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 3 (627) Пятніца, 28 студзеня 1966 г. Год выдання XIX. Цана 1 кап.

## ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ

*Гэты нумар прысвячаецца табе, завочнік. Ты ў нашай студэнцкай сям'і роўны з роўнымі, працавіты з працавітымі. Аб нашым універсітэце мы расказваем табе, аб тваіх поспехах і клопатах. Мы заўсёды рады атрымліваць твае лісты, а гэты нумар, думаем, будзе напамінаць табе аб родным універсітэце імя дарагога Ільіча.*

# УНІВЕРСІТЭТ, У ЯКІМ ТЫ ЗАЙМАЕШСЯ...

НАШ універсітэт — самая старэйшая навучальная установа ў рэспубліцы. Ён быў створаны дзякуючы перамозе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, калі беларускі народ атрымаў сваю самастойнасць і дзяржаўнасць. Ужо ў першыя дні існавання рэспублікі беларускі ўрад абвясціў аб адкрыцці ў Мінску Дзяржаўнага універсітэта. Але гэтаму перашкодзіла белапольская акупацыя. Неўзабаве пасля вызвалення Мінска, 30 кастрычніка 1921 года, адбылося ўрачыстае адкрыццё універсітэта.

Амаль за сорак пяць год свайго існавання універсітэт ператварыўся ў буйны навуковы цэнтр падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукова - даследчых устаноў, вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў нашай рэспублікі.

Зараз ва ўніверсітэце на дзесяці яго факультэтах атрымлівае вышэйшую адукацыю 11.825 студэнтаў. У тым ліку 4.232 завочнікі.

Іх выхоўвае вялікі атрад вучоных—654 выкладчыкі, з іх 53 дактары і прафесары, 242 кандыдаты навук і дацэнты. Выкладанне і выхаванне студэнтаў вядзецца на багатай базе навукова-даследчых лабараторый, шматлікіх кабінетаў, каштоўнага навуковага абсталявання. Універсітэт мае біялагічную і біёлага-геаграфічную вучэбна-навуковыя станцыі, гісторыка-археалагічны, мінералагічны, заалагічны музеі. Не так даўно арганізаваўся нумізматычны кабінет, які налічвае каля васьмі тысяч рэдкіх старажытных манет, якія знойдзены на Беларусі. У хуткім часе будзе адкрыт кабінет па сацыялогіі.

Універсітэт размешчан у адным з самых буйных будынкаў, які знаходзіцца ў цэнтры горада. Галоўны корпус універсітэта уступае толькі Дому Урада. Але нягледзячы на гэта, прадаўжаецца буйнае будаўніцтва новых вучэбных карпусоў. На стадыі завяршэння знаходзіцца корпус радыёэлектронікі. Хуткімі тэмпамі ўзводзіцца новы корпус хімічнага факультэта. Ён будзе забяспечаны самым навейшым навуковым абсталяваннем. У яго светлыя і прасторныя аўдыторыі прыйдуць сотні студэнтаў.

Для паспяховага навучання студэнтаў універсітэцкая бібліятэка мае больш паўмільёна кніг па самых розных галінах навукі. У яе прасторных чытальнях кожны дзень настойліва павышаюць свае веды тысячы студэнтаў. Штодня папаўняецца і папаўняцца яе кніжны фонд падручнікамі, манаграфічнымі выданнямі па розных галінах навукі. Акрамя кніг, якія мае бібліятэка, кожны студэнт можа атрымаць патрэбную для яго кніжку па міжбібліятэчнаму абанементу. Нядаўна бібліятэцы за выдатнае абслугоўванне студэнтаў, выкладчыкаў быў уручан дыплом «Лепшай бібліятэцы вну рэспублікі».

Беларускі Дзяржаўны універсітэт рыхтуе не толькі спецыялістаў для народнай гаспадаркі, але і з'яўляецца сапраўднай кузняй навуковых кадраў як для самога універсітэта, так і для іншых вышэйшых навучальных устаноў і навукова-даследчых інстытутаў.

Пры універсітэце працуюць вучоныя Саветы па гуманітарных і прыродазнаўчых навуках. Кожны месяц адбываюцца абароны доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

У свой час закончылі філалагічны факультэт нашага універсітэта такія вядомыя дзеячы беларускага народа, як Кандрат Крапіва, Пятро Глебка, Пятрусь Броўка, Паўлюк Трус, Іван Мележ, Мікола Аўрамчык, Янка Скрыган і такія маладыя паэты, як Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін і іншыя.

Пры рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» працуе літаратурнае аб'яднанне «Узлёт».. На яго пасяджэннях студэнты—паэты і празаікі чытаюць свае творы, наладжваюць сустрэчы з вядомымі беларускімі паэтамі. Нядаўна выйшаў новы зборнік маладых паэтаў-узлётаўцаў пад назвай «Узлёт».

Студэнты нашага універсітэта не толькі паспяхова авалодваюць ведамі, яны з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі грамадскага жыцця. Вось ужо каторы год запар вялікі атрад студэнтаў накіроўваецца на цаліну будаваць школы, дамы адпачынку, калгасныя і саўгасныя сядзібы. Шмат цаліннікаў універсітэта за выдатную работу на будоўлях Казахстана ўзнагароджана медалямі «За асваенне цаліны», ганаровымі граматамі, каштоўнымі падарункамі. Сёлета цаліннікі нашага універсітэта прывезлі з цаліны пераходны чырвоны сцяг «Лепшаму атраду цаліннікаў».

Шмат студэнтаў універсітэта мае магчымасць удзельнічаць у мастацкай самадзейнасці. На раённых, гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх конкурсах нашы самадзейныя артысты займаюць адно з першых месц. Зараз у нас працуюць сем калектываў мастацкай самадзейнасці, якія налічваюць каля чатырохсот студэнтаў. Гэта Народная харавая капэла, аркестр народных інструментаў, тэатральны, танцавальны калектывы і эстрадна - канцэртная брыгада «Вясёлы дэсант». Самадзейныя артысты універсітэта выступаюць з канцэртамі не толькі ў нашай рэспубліцы, але і ў суседніх: цяпер яны збіраюцца паехаць з канцэртам у Вільню.

Ва універсітэце спартыўны клуб і кафедра фізічнага выхавання і спорту вядуць вялікую работу па ўмацаванню здароўя і павышэння спартыўнага майстэрства студэнтаў. Больш за 2,5 тысячы студэнтаў рэгулярна займаецца ў спартыўных секцыях па дваццаці чатырох відах спорта. На возеры Нарач для студэнтаў і супрацоўнікаў маецца спартыўна-аздараўленчы лагер. Штогод праводзяцца і міжфакультэцкія традыцыйныя спартакіяды. З гонарам нашы спартсмены выступаюць у рэспубліканскіх і на ўсесаюзных студэнцкіх спартыўных гульнях.

Шмат сярод нашых студэнтаў і аматараў турысцкіх паходаў. Існуе цэлая секцыя па альпінізму і турызму, якая наладжвае вучобу з навічкамі, рыхтуецца да зімовых і летніх паходаў па роднай Беларусі, у Карпаты, на Каўказ, Урал, у Карэлію і іншыя раёны нашай краіны.

Зараз на канікулах турысты універсітэта зробяць прабег на лыжах па партызанскіх сцежках Налібоцкай пушчы, у Беразіно, пабываюць у Оршы і інш.



У чытальнай зале бібліятэкі універсітэта.
Фота А. КАДЗЕТА.

## ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ

# ЗАВОЧНІКУ—ВЕДЫ ШЧОДРЫЯ, ПОЎНЫЯ!

Мінулы навучальны год на завочным факультэце паказаў, што дэканаты, кафедры, партыйныя і грамадскія арганізацыі нашага універсітэта правялі значную работу па далейшаму палепшанню і ўдасканаленню навучальнага працэсу. Так, да работы з завочнікамі былі прыцягнуты лепшыя сілы штатнага прафесарска-выкладчыцкага калектыву. У выніку — значна павысіўся ўзровень лекцый, семінарскіх заняткаў. За гэты ж час была праведзена другая навукова-метадычная канферэнцыя, на парадку дня якой была праблема завочнага навучання. Удзельнічалі ў ёй усе кафедры універсітэта. Усяго было заслухана і абмеркавана семдзесят два навукова-метадычныя даклады, тэзісы якіх папярэдне выйшлі асобным зборнікам.

Прароблена работа не магла не паўплываць на вучобу студэнтаў-завочнікаў. Паспяхова выканала вучэбны план — восемдзесят працэнтаў. Сур'ёзнымі адносінамі да вучобы, глыбокімі ведамі вылучаецца тая частка студэнцтва, якая вучыцца на суадпаведным профілю работы аддзяленні. Сярод лепшых студэнтаў — І. Ф. Якаўлеў (VI курс аддз. філасофіі), Л. А. Ціванёнак (IV курс аддз. геаграфіі), М. В. Драбушэвіч (IV курс аддз. беларускай мовы і літаратуры), А. Е. Байкоў (VI курс біялагічнага аддз.), Г. І. Сачок (II курс матэматычнага аддз.), П. І. Каленік (II курс аддз. беларускай мовы і літаратуры), Л. А. Сталярчук (VI курс аддз. рускай мовы і літаратуры). Для гэтых студэнтаў вучоба ва універсітэце стала самай важнай і адказнай задачай. На сесію яны з'яўляюцца заўсёды старанна падрыхтаванымі. Экзаменатары заўсёды задаволены імі.

Але нельга гэтага сказаць аб іншай частцы студэнтаў, якая мала працуе над павышэннем свайго навуковага ўзроўню. Вось прыклад: былы студэнт юрыдычнага аддзялення Дземчанка. Ва універсітэт ён паступіў у 1958 годзе як аператар студыі тэлебачання, у апошні час працуе інжынерам, а вучыўся па спецыяльнасці юрыста. У 1962 годзе за невыкананне вучэбнага плана быў выключан з універсітэта, але пасля неаднаразовых абяцанак і просьб мы зноў далі яму магчымасць вучыцца. Ды дарэмна мы паверылі яму. У 1964 годзе ён падаў заяву на акадэмічны адпачынак. Дэканат і тут пайшоў насустрач гора-студэнту Мільганула яшчэ паўтары гады, і толькі тады Дземчанка ўспомніў, што ён ужо восьмы год студэнт, хоць студэнтам ён ужо не быў, справядліва выключаны за тое, што парваў усялякую сувязь з універсітэтам.

Ёсць і такія студэнты (праўда, іх у нас мала), якія хочуць ліквідаваць сваю запазычанасць або здаць той ці іншы экзамен несумленным шляхам. Так, студэнтка V курса аддзялення гісторыі Трамбіцкая «ў сувязі з заканчэннем тэрміна здачы экзамена па новай гісторыі», як яна піша ў сваёй тлумачальнай запісцы, здала экзамен сама сабе, падрабіўшы подпіс выкладчыка. Такім жа чынам паступіў студэнт II курса аддзялення філасофіі Януковіч са «здачай» экзамена па нямецкай мове. Некаторыя студэнты ў такіх выпадках стараюцца «выкруціцца» пры дапамозе розных фіктыўных давядак, якія «пацвярджаюць хваробу» студэнта. Дарэчы, некаторыя з іх такім чынам «перахварэюць» за час вучобы ледзь не ўсімі хваробамі, якія толькі ёсць на свеце. А хвароба ў іх толькі адна — недабрасумленныя адносіны да сваіх абавязкаў.

У цэлым, аднак, трэба сказаць, што якасць падрыхтоўкі студэнтаў-завочнікаў у параўнанні са стацыянарам патрабуе яшчэ большай увагі. Пры агульным росце паспяховасці ў іх дамініруючай ацэнкай на жаль пакуль што «здавальняюча» (74,6 працэнтаў). Большасць студэнтаў-завочнікаў аб лепшых ацэнках нават і не мараць. Іх задавальняе, як кажуць, «нічыя». А з гэтым мірыцца нельга.

Сёння, калі патрабаванні на вытворчасці да спецыяліста значна павысіліся, тройка ў залікоўцы завочніка — сведчанне слабаватасці яго ведаў.

Адзначым, што асобныя кафедры паменшылі кантроль за якасцю правядзення вучэбных заняткаў на завочным факультэце. Калі на стацыянары наведванне і ўзаеманаведванне лекцый з наступным абмеркаваннем практыкуецца вельмі часта, то на завочным аб гэтым амаль не чутно.

Некаторыя кафедры вельмі мала ўвагі аддаюць завочнаму навучанню. Яны не накіроўваюць самастойнай работы завочнікаў у межсесійны перыяд, не распрацоўваюць методыкі самастойнай работы студэнтаў па вывучэнню асобных дысцыплін, па выкананню імі курсавых і дыпломных работ. Асобныя выкладчыкі безадказна адносяцца да рэцэнзіравання кантрольных работ, пішуць недобраякасныя рэцэнзіі — фармальныя адпіскі без аналізу станоўчых і асаб-

(Заканчэнне на 2-й старонцы).

## *ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ*

# ЗАВОЧНІКУ—ВЕДЫ ШЧОДРЫЯ, ПОЎНЫЯ!

(Заканчэнне).

ліва адмоўных бакоў кантрольных работ, без практычных рэкамендацый, як палепшыць работу. Трэба ў самы кароткі час гэтыя хібы ў нашай рабоце ліквідаваць.

У некаторых выпадках самі рэцэнзіі бываюць з памылкамі. Замест трох-пяці дзён асобныя выкладчыкі — В. М. Седнеў, С. С. Коўшар, В. В. Цімашэнка затрымліваюць рэцэнзіраванне на трыццаць пяць—сорак дзён, і тым самым не даюць асобным завочнікам своечасова перарабіць работу і атрымаць заработную плату за час побыту на сесіі.

Як правіла, кафедры не выконваюць сваіх законных абавязкаў—не менш, як раз у семестр абмяркоўваць ход рэцэнзіравання работ студэнтаў. А кафедра вышэйшай алгебры, матэматычнага аналізу, біялагічнага і гістарычнага аддзяленняў даручаюць чытанне адказных курсаў недастаткова вопытным, малакваліфікаваным выкладчыкам. Горш таго, некаторыя кафедры ўсяго толькі за некалькі дзён да сесіі, а то і ў самую сесію размяркоўваюць нагрузку па завочнаму факультэту (кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў, геаметрыі і іншых).

Некаторыя загадчыкі кафедраў не зусім правільна падыходзяць да планавання адпачынкаў і навуковых камандзіровак, чым зрываюць заняткі. Па віне кафедр студэнты-завочнікі не ўцягнуты ў навуковую работу. Чамусьці ва універсітэце лічыцца, што завочная вучоба і навуковыя даследаванні — розныя рэчы. Такая практыка адмоўна ўплывае на ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі завочнікаў.

Наша задача ў тым, каб як мага хутчэй ліквідаваць недахопы. Наступае першая ў гэтым годзе лабараторна-экзаменацыйная сесія, у ходзе якой мы павінны прыкласці ўсе сілы, каб яна прайшла на самым высокім узроўні.

**У. Р. ІВАШЫН.**
**дэкан завочнага факультэта.**
**В. І. СТАРАВОЙТАЎ,**
**намеснік дэкана.**

# БЕРАЖЫЦЕ НАРОДНАЕ СЛОВА!

*ДЫЯЛЕКТАЛАГІЧНАМУ гуртку—неўзабаве дваццаць гадоў. Ён быў заснаваны пры кафедры беларускай мовы ў 1947 годзе. Галоўная яго задача заключалася ў збіранні лексічных багаццяў беларускіх народных гаворак для «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы». За гады руплівай працы нашы гуртко̆ўцы абследавалі 153 населеныя пункты Беларусі. У збіранні прымалі непасрэдны ўдзел студэнты філалагічнага факультэта, настаўнікі-завочнікі, аспіранты і выкладчыкі пад кіраўніцтвам заснавальніка дыялекталагічнага гуртка Марыі Андрэеўны Жыдовіч.*

*Гурток мае сваю багатую гісторыю. У ім працавалі і набіраліся вопыту выкладчыкі нашага універсітэта Л. М. Шакун, Е. С. Мяцельская, Я. М. Камароўскі, І. М. Шчарбакова, Ул. М. Лазоўскі і іншыя. Многія члены нашага гуртка працуюць зараз у Акадэміі навук БССР. Гэта дацэнт Б. С. Лапаў, кандыдаты навук А. А. Крывіцкі, А. К. Юрэвіч, У. В. Анічэнка, А. В. Мажэйка, В. М. Казбярук, А. С. Ліс, Я. Н Рапановіч, Л. І. Бурак, М. І. Прашковіч, Л. І. Арашонкава і іншыя.*

*З 1959 года гуртко̆ўцы збіраюць лексічныя багацці беларускай народнай мовы для дыялектычнага слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак і слоўніка радзімы Янкі Купалы. Часта наладжваюцца экспедыцыі, дзе па адпаведных праграмах члены дыялекталагічнага гуртка запісваюць лексіку народных гаворак. Але гэтыя экспедыцыі не такія ўжо працяглыя, і нельга грунтоўна выявіць глыбіні народнай мовы.*

*Тут хочацца звярнуцца з просьбай да нашых настаўнікаў-завочнікаў. Вы жывяце ў самай гушчы народа, штодня чуеце народнае слова, трапны, дасціпны выраз. На вашых вачах выношваецца, выкрышталізоўваецца моўнае багацце. А ці заўсёды вы яго запамінаеце, запісваеце ў запісную кніжку?! А як было б добра, каб не прапускалася ніводнае такое слова народа! Трэба заўсёды мець пры сабе алоўак і блакнот, прыслухоўвацца да гаворкі родных мясцін і занатоўваць усё лепшае з народнай лексікі, асабліва тыя словы, якіх няма ў апошнім «Беларуска-рускім слоўніку» і якія чым небудзь адрозніваюцца ад літаратурнай нормы, маюць адметнае значэнне. Не выпускайце з поля зроку вусную народную творчасць, народныя прымаўкі, прыказкі, трапныя выразы, каламбуры. Свае запісы дасылайце на кафедру беларускай мовы нашага універсітэта, дакументуючы іх, кім, ад каго, калі яны зроблены.*

*Л. АКАЛОВІЧ,*
*аспірант кафедры беларускай мовы.*

# 13 СТАРОНАК ГІСТОРЫІ

**30 КАСТРЫЧНІКА 1921 года адбылося ўрачыстае адкрыццё першай вышэйшай школы Савецкай Беларусі—Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Упершыню рэгулярныя заняткі ва універсітэце пачаліся з 1 лістапада таго ж года.**

**ІМЯ УЛ. І. ЛЕНІНА прысвоілі БДУ у 1949 годзе, у дзень вялікага нацыянальнага свята беларускага народа—30-ю гадавіну ўтварэння Савецкай Беларусі.**

**У АСАБІСТАЙ бібліятэцы Ул. І. Леніна ў Крамлі захоўваецца больш дзесятка кніг, якія напісаны вучонымі нашага універсітэта. Сярод іх — «Нарысы беларускай літаратуры» прафесара М. А. Янчука, кнігі Ул. І. Пічэты і М. М. Нікольскага.**

**ПЕРШЫМ РЭКТАРАМ універсітэта быў вядомы вучоны—прафесар Уладзімір Іванавіч Пічэта (1878—1947). Ён чытаў лекцыі па гісторыі народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі, напісаў шмат буйных навуковых прац па гісторыі Беларусі, Літвы і Украіны.**

**НА ПЕРШЫ КУРС трох факультэтаў універсітэта (рабочага, грамадскіх навук і медыцынскага) было прынята 1390 чалавек. Большасць студэнтаў былі дзеці рабочых і сялян.**

**ВЯЛІКУЮ ПЕДАГАГІЧНУЮ і навуковую работу на кафедры беларускай мовы універсітэта вёў народны паэт Беларусі Якуб Колас.**

**СЯРОД ПЕРШЫХ чатырнаццаці прафесараў універсітэта былі В. М. Доўнар—Запольскі (гісторыя Беларусі), В. Н. Перцаў (гісторыя сярэдніх вякоў), Е. Е. Сіроцін (фізіка), Б. Я. Эльберт (мікрабіялогія), Н. А. Янчук (беларуская літаратура) і інш. У 1927 годзе ва універсітэце працавала 49 прафесараў, 51 дацэнт, 74 асістэнты, 39 ардынатараў. Колькасць студэнтаў на той жа год склала ўжо 2.672 чалавек.**

**У 1925 ГОДЗЕ наш універсітэт даў народнай гаспадарцы рэспублікі першых выпускнікоў — 119 эканамістаў і 117 юрыстаў.**

**АСПІРАНТУРА пры універсітэце была адкрыта ў 1927 годзе. Яна паспяхова вырашае задачу падрыхтоўкі навуковых і выкладчыцкіх кадраў.**

**НА БАЗЕ Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў пачатку трыццатых гадоў былі створаны інстытуты: медыцынскі, народнай гаспадаркі, палітэхнічны і педагагічны.**

**З 1922 па 1924 год ва універсітэце працаваў вядомы беларускі дзеяч, народны артыст БССР Уладзіслаў Галубок.**

**ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ ў 30-х гадах выдаваўся часопіс «Шлях студэнцтва»—орган прафсаюзнай арганізацыі, дзе друкаваліся вершы і апавяданні студэнтаў, асвятлялася дзейнасць студэнцкіх навуковых гурткоў, друкаваўся дыскусійны матэрыял.**

**ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ былі створаны ў свой час і цяпер існуюць заалагічны, геалагічны, гісторыка-археалагічны музеі і батанічная аранжарэя.**

# Нашы інтэрв'ю

...Бяда з кантрольнымі работамі. Невядома па якой прычыне іх затрымліваюць на месяц ці нават больш. Здараецца часам, як у мяне у гэтую сесію, што курсавую работу зусім згубілі. Я прыехаў у Мінск і пасля доўгіх пошукаў знайшоў яе ў адным са сталоў канцылярыі завочнага факультэта. Праверыць яе, вядома, не змаглі, а час не чакае—экзамены...

А. Н. ШАРАМЕТ,
студэнт-завочнік, VI курс геафака.

---

Я працую ў Вязоўніцкай васьмігадовай школе Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці і з'яўляюся студэнтам-завочнікам 3-га курса беларускага аддзялення. У кожнага завочніка многа розных цяжкасцей. Так, мае аднакурснікі скардзяцца, што універсітэт слаба забяспечвае падручнікамі, асабліва па псіхалогіі і лацінскай мове. Студэнты хвалююцца таксама, што заліч̇аныя работы часта залежваюцца ў канцылярыі завочнага навучання, а іх аўтарам нічога невядома пра тое, ці залічана яна ці не.

Было б нядрэнна, каб сістэму завочнага навучання крыху ўдасканалілі. Мы прапаноўваем вось што. Адзін раз збірацца ў месяц ва універсітэце, каб праслухаць кансультацыю па якому-небудзь прадмету, а затым можна было б здаць гэты прадмет да сесіі. Такія мерапрыемствы можна было б праводзіць кожную другую ці чацвёртую нядзелю кожнага месяца, у дзень, калі кожны з нас вольны.

Э. ЯБЛОНСКІ.

---

Калі, нарэшце, адміністрацыя універсітэта рашыць пытанне аб забеспячэнні студэнтаў-завочнікаў інтэрнатам? Для таго, каб атрымаць месца ў інтэрнаце, трэба напісаць і падпісаць шмат розных папер. Бывае, што пакуль зробіш такі «бегунок», пройдзе палова сесіі або ў інтэрнаце ўжо не акажацца незанятых месц. А ці нельга было б абыйсціся без усяго гэтага пустога марнатраўства каштоўнага часу. Няўжо нельга рашаць пытанне аб інтэрнаце каменданту ці кастэляншы?!

Н. РАМАШКА.

## *ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ*

# У СЯМ'І АДЗІНАЙ

Краінам Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ,якія толькі што вызваліліся з-пад каланіяльнага прыгнёту, неабходна рашыць складаныя задачы будаўніцтва новага жыцця. Трэба стварыць і развіваць нацыянальную эканоміку, культуру, навуку. Патрэбны нацыянальныя кадры высокакваліфікаваных спецыялістаў. Ва ўсім гэтым Савецкі Саюз, краіны ўсяго сацыялістычнага супольніцтва аказваюць вялікую і бескарыслівую дапамогу. Каб падрыхтаваць дапытлівых юнакоў і дзяўчат для вучобы па выбранай спецыяльнасці, у вну і тэхнікумах СССР, пры некалькіх нашых універсітэтах і інстытутах створаны падрыхтоўчыя факультэты. У Беларускім Дзяржаўным універсітэце імя Ул. І. Леніна такі факультэт існуе ўжо з 1961—1962 навучальнага года.

Спачатку ў нас займаліся толькі пасланцы рэвалюцыйнай Кубы. Зараз жа каля 120 студэнтаў з рэспублікі Куба і краін Афрыкі: Ганы, Малі, Кеніі, Танзаніі, Самалі, С'ера-Леоне, Каралеўства Бурундзі, Мазамбіка, «партугальскай» Гвінеі, Паўднёва-Афрыканскай рэспублікі.

Нашы выкладчыкі, супрацоўнікі універсітэта, не шкадуючы сваіх сіл, робяць усё для таго, каб студэнты сталі ў будучым кваліфікаванымі спецыялістамі, актыўнымі будаўнікамі новага жыцця ў сваіх краінах.

На працягу года замежныя студэнты вывучаюць рускую мову, курс «Савецкі Саюз», а таксама ў адпаведнасці з будучай спецыяльнасцю — матэматыку, фізіку, хімію, чарчэнне, біялогію, эканамічную геаграфію СССР і іншыя.

Для вывучэння рускай мовы студэнты размяркоўваюцца па пяць-сем чалавек у групе. На факультэце ёсць фанетычны кабінет з сучаснай апаратурай, дзе замежныя студэнты авалодваюць фанетыкай рускай мовы, працуюць над сваім вымаўленнем.

Заняткі па агульнаадукацыйных курсах часта суправаджаюцца дэманстрацыяй кароткаметражных навукова-папулярных фільмаў. На факультэце ёсць кінаўстаноўка.

Як і на ўсіх факультэтах нашага універсітэта, у нас здаюцца залікі і экзамены, зімой і летам. З зімовай экзаменацыйнай сесіі гэты год выдатнікамі вучобы выйшлі студэнты Бартэлемі Бісет Віктар і Фера Малькон Ласаро Іван (Куба), Сінах Джон Тамба (С'ера-Леоне), Амані Джэймс Аддэй (Гана), Хассан Алі Касім Абды (Самалі), Мзабітэзамазабо Жэрар (Бурундзі) і многія іншыя.

Як правіла, пасля падрыхтоўчага факультэта нашы выхаванцы паступаюць у адпаведнасці з іх падрыхтоўкай і выбранай спецыяльнасцю ў вну і тэхнікумы розных гарадоў Савецкага Саюза. Некаторыя застаюцца ў нашым універсітэце на фізічным, хімічным ці іншых факультэтах.

На факультэце штогод па традыцыі праводзяцца вечары сустрэчы выпускнікоў факультэта розных гадоў з новым папаўненнем і выкладчыкамі, адзначаюцца ўрачыстыя нацыянальныя святы народаў тых краін, адкуль прыехалі студэнты, святы савецкіх людзей, а таксама памятныя міжнародныя даты. Замежныя сябры разам з савецкімі студэнтамі прымаюць актыўны ўдзел у святочных канцэртах, выступаюць у школах сталіцы, на прадпрыемствах, па радыё і тэлебачанню. Ахвотна выязджаюць яны і на сустрэчы з нашай моладдзю і насельніцтвам за межы Мінска. У гэтым навучальным годзе неаднаразова пабывалі ўжо ў Маладзечна і Барысаве.

Кожны год летам выязджаюць яны на экскурсію ў Брэсцкую крэпасць, на Нарач, і ў іншыя куткі нашай рэспублікі.

Цікавяцца зарубежныя таварышы ўсім. І таму на факультэце для іх паслуг працуе школа культуры, кіналекторый, праводзіцца шмат сустрэч са знатнымі людзьмі, Героямі Савецкага Саюза, экскурсіі на прадпрыемствы, у Палац піянераў, на Рэспубліканскую станцыю юнага тэхніка, у музей, на выстаўкі.

Нашы сябры жывуць адзінай дружнай студэнцкай сям'ёй, разам з савецкімі студэнтамі ў іх другім, як яны часта кажуць, родным доме — студэнцкім інтэрнаце. У адным інтэрнаце, у адных пакоях. Савецкія студэнты дапамагаюць сваім сябрам у вучобе.

Цяпер — канікулы. І н[illegible] шых зарубежных сяброў ча[illegible] з яе прыгодамі беларуская [illegible]

**Ул. ГАЛАЙ[illegible]**

Рэдактар [illegible]

АТ 00742 **Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».**